ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
17.03.2020 №28

Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў
«Вытокі роднай мовы»
для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць
адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Вытокі роднай мовы» прызначана для I–IV класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Мэта – актыўнае засваенне актуальнай лексікі, пашырэнне слоўніка навучэнцаў для ажыццяўлення камунікацыі на беларускай мове і фарміравання нацыянальнага светапогляду.

3. Задачы:

развіваць цікавасць у вучняў да вывучэння роднай мовы;

фарміраваць у навучэнцаў актыўны слоўнікавы запас на лепшых узорах фальклору і літаратурнай спадчыны;

вучыць успрымаць навакольны свет і сябе ў ім, спасцігаць дабрыню і чалавечнасць у зносінах, павагу і пашану да сваіх родных, народа, Айчыны;

ствараць эмацыянальна-прыемнае асяроддзе для эфектыўнага ўспрымання беларускай мовы і маўленчай дзейнасці навучэнцаў.

4. Зыходзячы з узроставых асаблівасцей навучэнцаў, падчас арганізацыі факультатыўных заняткаў неабходна ўжываць тыя формы і метады работы, што дазваляюць пазнаёміць школьнікаў непасрэдна з прадметамі і з’явамі рэчаіснасці.

Асноўнымі метадамі навучання з’яўляюцца:

расказ настаўніка з элементамі разважання, доказу і даступнымі прыкладамі;

слуханне і чытанне фальклорных і літаратурных тэкстаў;

моўны аналіз тэкстаў з мэтай глыбокага пранікнення ў сутнасць з’яў;

камунікатыўныя практыкаванні накіраваныя на авалоданне мовай як сродкам суразмоўніцтва і выяўлення свайго ўнутранага – Я;

моўнае канструяванне (утварэнне форм слоў, словазлучэнняў, сказаў і невялікіх тэкстаў);

выкарыстанне слыхавой нагляднасці (выразнае чытанне, арфаэпічна правільнае вымаўленне, інтанацыя);

выкарыстанне зрокавай нагляднасці (карціны, малюнкі, відэаролікі, вырабы рамеснікаў);

арганізацыя гульняў і гульнёвых сітуацый для палягчэння вучэбнага працэсу і ажыўлення яго.

Разам з франтальнымі і індывідуальнымі формамі навучання неабходна выкарыстоўваць калектыўную, групавую работу, работу ў парах. Рэкамендуецца арганізоўваць такія разнастайныя формы работы,

як заняткі-экскурсіі, мэтавыя прагулкі, заняткі-гульні, заняткі-падарожжы, заняткі-святы і г. д.

5. Структура факультатыўных занятка залежыць ад пастаўленых мэты і задач, але абавязковымі элементамі з’яўляюцца:

увядзенне ў тэму праз пастаноўку праблемных пытанняў, праз загадкі, прыказкі і прымаўкі, скорагаворкі і г. д.;

слоўнікавая работа;

праца з тэкстам;

арганізацыя камунікатыўных сітуацый;

рэфлексія.

Змест вучэбнага матэрыялу прадстаўлены наступнымі модулямі:

«З імі слаўна забаўляцца, імі добра любавацца» (І клас);

«Вакол мяне дзівосны свет!» (ІІ клас);

«Я жыву сярод людзей» (ІІІ клас);

«Для чаго мы, людзі, на зямлі жывём» (ІV клас).

Настаўнік можа ўнесці пэўныя карэктывы ў змест і структуру заняткаў у залежнасці ад маўленчай падрыхтаванасці і ўзросту навучэнцаў, наяўнасці ці адсутнасці матэрыяльнай базы і пэўных аб’ектаў: заапарк, «жывы» куток, краязнаўчы музей, музей народных промыслаў, рамесніцкія майстэрні і г. д.

6. У выніку засваення зместу вучэбнай праграмы факультатыўных заняткаў «Асновы моўнай культуры»::

6.1. вучні І класа павінны:

ведаць:

скорагаворкі, пацешкі, лічылкі, вершы;

жывёл бліжняга асяроддзя;

умець:

вымаўляць і выкарыстоўваць скорагаворкі, пацешкі, лічылкі, вершы ў гульнях;

адрозніваць жывёл па ўласцівых ім якасцях і прытрымлівацца з імі пэўных правіл паводзін

успрымаць на слых і разумець вершаваныя тэксты;

вусна будаваць элементарныя выказванні з выкарыстаннем вывучанай лексікі і правільным вымаўленнем спецыфічных беларускіх гукаў;

6.2. вучні ІІ класа павінны:

ведаць:

скорагаворкі, пацешкі, лічылкі, вершы;

адказы на пытанні па змесце твора;

умець:

ужываць скорагаворкі, пацешкі, лічылкі, вершы ў пэўных маўленчых сітуацыях;

выкарыстоўваць словы ў адпаведных ім значэннях, правільна будаваць словазлучэнні і сказы;

ужываць называць па-беларуску найбольш распаўсюджаныя расліны і жывёл лясоў, палёў, лугоў, балот, вадаёмаў;

наладжваць гульні з выкарыстаннем набытай лексікі;

выконваць пэўную ролю пры драматызацыі твораў;

самастойна чытаць невялікія творы беларускіх пісьменнікаў;

6.3. вучні III класа павінны:

ведаць:

словы, звароты ветлівасці, устойлівыя словазлучэнні;

ведаць творы беларускіх аўтараў;

умець:

выкарыстоўваць у жыццёвых абставінах словы і звароты ветлівасці;

будаваць разгорнутыя адказы на пытанні;

выкарыстоўваць устойлівыя словазлучэнні ў моўнай практыцы;

наладжваць розныя віды драматызацыі і гульні з выкарыстаннем набытай лексікі;

клапаціцца аб сваіх родных, станоўча адносіцца да іншых людзей;

самастойна выбіраць у бібліятэцы творы беларускіх аўтараў для чытання;

6.4. вучні IV класа павінны:

ведаць:

старажытныя рамёствы беларусаў і сучасныя прафесіі;

умець:

адрозніваць старажытныя рамёствы беларусаў;

называць сучасныя прафесіі і расказваць пра іх;

будаваць паведамленні на пэўную тэму;

выказваць свае меркаванні, выкарыстоўваючы ўстойлівыя словазлучэнні;

самастойна ўдзельнічаць у маўленчых сітуацыях, гульнях;

выбіраць для самастойнага чытання творы беларускіх аўтараў пэўных жанраў.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### I клас (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
### «З імі слаўна забаўляцца, імі добра любавацца»

Слыхавое ўспрыманне пацешак, вершаў, забаўлянак, апавяданняў і суправаджэнне іх гульнявымі дзеяннямі, дагаворваннем вершаваных радкоў. Спяванне калыханак, адгадванне загадак, тлумачэнне значэнняў слоў, адказы на пытанні, гутаркі па змесце ўспрынятых на слых твораў,

увядзенне новых слоў у актыўную лексіку праз складанне выказванняў, правільнае вымаўленне спецыфічных беларускіх гукаў.

У хаце і каля хаты (18 гадзін)

«Ходзіць хітры кот-варкот» (3 гадзіны).

«Коцік-варкоцік». Знешні выгляд: поўсць, лапы, кіпцюры, вусы, вушы. Паводзіны.

Слоўнік: кот, коцік, коця.

Матэрыялы. Табліца[1] «Коцік-варкоцік». Вершаваныя творы: «А ты, каток шэры» (з народнага); Ю. Свірка «Мурлыка»; Н. Галіноўская «Коцік-варкоцік»; Л. Шырын «Лежабока рыжы кот»; В. Гардзей «Брудным быць не хоча коцік».

«Кошка і кацяняты». Знешні выгляд. Паводзіны.

Слоўнік: кошка, котка, кацяня, кацянятка.

Матэрыялы. Табліца «Кошка і кацяняты». Вершаваныя творы: І. Багдановіч «Кошка Муся»; А. Кавалюк «Мыюцца кацяняты»; В. Сцяпурка «Мурка дзетак калыхала».

«Села кошка на парожку». Каты вучацца, забаўляюцца, хварэюць, лечацца.

Слоўнік: спрытны, рухавы.

Матэрыялы. Табліца «Села кошка на парожку». Вершаваныя творы: «Села котка на парожку» (з народнага); С. Шушкевіч «Пайшоў коўзацца каток»; А. Вольскі «Коцева грамата»; В. Вітка «У кожным кутку (загадка)»; А. Зэкаў «Прастудзіўся кот».

«Ходзіць важна певень-спевень» (3 гадзіны).

«Пеця, гожы певень». Знешні выгляд: пер’е, грэбень, дзюба, бародка, паходка, шпоры. Паводзіны.

Слоўнік: певень, пеўнік, пеця.

Матэрыялы. Табліца «Пеця, гожы певень». Вершаваныя творы: «Ходзіць певень па капусце» (з народнага); Я. Колас «На падворку певень ходзіць»; Р. Барадулін «Певень»; З. Бірала «Пеця, гожы певень»; У. Місцюк «Толькі пеўніку не спіцца».

«Прыляцелі куры». Курыная сям’я. Квактуха і кураняты.

Слоўнік: курыца, курачка, квактуха, кураня, куранятка.

Матэрыялы. Табліца «Прыляцелі куры». Вершаваныя творы: «Люлі, люлі, люлі, прыляцелі куры» (з народнага); Л. Геніюш «Курачка квактала»; А. Каско «Курачка-квактуха»; В. Шніп «Кураняты».

«Ехаў певень з базару». Куры вучацца, забаўляюцца, хварэюць, лечацца.

Слоўнік: падарунак, спеўнік, ахрып.

---

[1] Тут і далей прапанаваны табліцы, якія ўтрымліваюць малюнак пэўнай жывёлы ці сюжэтны малюнак, слоўнік, лагічнае заданне або вершаваныя радкі.

Матэрыялы. Табліца «Ехаў певень з базару». Вершаваныя творы. М. Пазнякоў «Ехаў пеўнік з базару»; Д. Бічэль-Загнетава «Маладыя пеўнікі»; С. Шушкевіч «Захварэў пявун, ахрып»; Л. Геніюш «Певень».

«У яго пушысты хвосцік». Знешні выгляд: поўсць, лапы, вушы, вочы. Паводзіны. Пароды (1 гадзіна).

Слоўнік: сабака, сабачаня, шчаня, шчанюк.

Матэрыялы. Табліца «У яго пушысты хвосцік». Вершаваныя творы: Н. Гілевіч «У яго пушысты хвосцік»; І. Сідарук «Тузік, лепшы мой сябрук»; Н. Галіноўская «Разумны Барбос»; І. Юкляеўскі «Жучка дрэмле каля ганку»; І. Бурсаў «У мяне багата спраў».

«Ідзе каза рагатая». Знешні выгляд: рогі, барада, капыты, вымя. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: каза, козачка, козлік, казляня.

Матэрыялы. Табліца «Ідзе каза рагатая». Вершаваныя творы: «Ідзе каза рагатая» (з народнага); С. Шушкевіч «Козачка-свавольніца»; І. Муравейка «Козлік бег бязрогі».

«Рагуля-малакуля». Знешні выгляд каровы: рогі, вымя. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: карова, цяля, цялушка, бычок.

Матэрыялы. Табліца «Рагуля-малакуля». Вершаваныя творы: «Бычок», «Пасярод двара» (загадка) (з народнага); А. Дзеружынскі «Рагуля-малакуля», «Я кармлю сваю цялушку»; М. Маляўка «Цёмная без вокан».

«Грывасты прыгажун». Знешні выгляд каня: грыва, капыты. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: конь, конік, жарабя, жарабятка.

Матэрыялы. Табліца «Грывасты прыгажун». Вершаваныя творы: З. Бядуля «Гэй, мой конік»; Н. Сторажава «Грывасты прыгажун»; А. Лойка «Жарабяткі»; М. Рудзішкін «Жарабятка скок ды скок».

«Вось які ў нас парсючок». Знешні выгляд: лыч, хвосцік. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: свіння, свінка, парсюк, парсючок.

Матэрыялы. Табліца «Вось які ў нас парсючок». Вершаваныя творы: А. Дзеружынскі «Вось які ў нас парсючок»; С. Шушкевіч «Парсючок пад'еў»; Н. Сторажава «Гаспадыня»; В. Сцяпурка «Парасяткі-дзіцяняткі».

«Воўна ў іх бялюткая». Знешні выгляд авечкі: поўсць. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: авечка, баран, ягня, ягнятка.

Матэрыялы. Табліца «Воўна ў іх бялюткая». Вершаваныя творы: А. Дзеружынскі «Воўна ў іх бялюткая»; С. Шушкевіч «Мой баран, баранок», «Ягнятка».

«Гого-гого, гусачок». Знешні выгляд: пер’е, шыя, дзюба, лапы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: гусь, гуска, гусак, гусачок, гусяня, гусянятка.

Матэрыялы. Табліца «Гого-гого, гусачок». Вершаваныя творы: «Гого-гого, гусачок» (з народнага); М. Башлакоў «Гусі»; Я. Крупенька «Просіць Верачка гусей».

«Крэкча качка раніцою». Знешні выгляд: пер’е, шыя, дзюба, нос, лапы, паходка. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: качка, качар, качаня.

Матэрыялы. Табліца «Крэкча качка раніцою». Вершаваныя творы: Г. Шмань «Крэкча качка раніцою»; В. Гардзей «Качар»; М. Чарняўскі «Што за дзіва качаняткі»; Р. Барадулін «Шукалі качаня».

«Па двары ідзе індык». Знешні выгляд: нос, хвост, пер’е. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: індык, індычка, індычаня.

Матэрыялы. Табліца «Па двары ідзе індык». Вершаваныя творы: Н. Сторажава «Па двары ідзе індык»; М. Пазнякоў «Чародкай невялікай»; А. Прохараў «Выхваляка»; К. Кірыенка «Індык-хвалько».

«Пад страхою ён гняздзіцца». Знешні выгляд вераб’я: пер’е, дзюбка, лапкі. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: верабей, вераб’іха, вераб’яняты.

Матэрыялы. Табліца «Пад страхою ён гняздзіцца». Вершаваныя творы: У. Мацвеенка «Пад страхою ён гняздзіцца»; Э. Грахавец «Верабейка ты мой»; А. Лойка «Верабейчык, верабей»; Н. Сторажава «У лазні».

«Ён не госць у Беларусі». Знешні выгляд бусла: пер’е, крылы, ногі, дзюба. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: бусел, бусліха, бусляня, буслянка.

Матэрыялы. Табліца «Ён не госць у Беларусі». Вершаваныя творы: К. Жук «Ён не госць у Беларусі»; М. Мятліцкі «Белы бусел на буслянцы»; А. Дзеружынскі «Скачуць маладыя бусляняты»; В. Гардзей «Буславы боты»; Н. Сторажава «Белы птах».

Знай, як з імі сябраваць. Паводзіны дзяцей з жывёламі (1 гадзіна).

Слоўнік: сябраваць, крыўдзіць, забіяка.

Матэрыялы. Табліца «Знай, як з імі сябраваць». С. Шушкевіч «Як з такімі сябраваць»; С. Валодзька «Галасы сяброў»; А. Пісьмянкоў «Кот і дог».

Бор цяністы – іхні дом (15 гадзін)

«Пад асінай зайкі след» (2 гадзіны).

«Зайчык маленькі». Знешні выгляд: поўсць, лапы, вушы, вочы. Паводзіны.

Слоўнік: зай, заяц, зайчыха, зайчаня.

Матэрыялы. Табліца «Зайчык маленькі». Вершаваныя творы: «Зайчык маленькі» (з народнага); І. Карэнда «Пад ядлоўцавым кустом»; Я. Крупенька «Зайка, дзе, скажы, твой дом?»; Ю. Свірка «Зайцава капуста»; А. Пісьмянкоў «Зайцаў хлеб»; П. Сушко «Пяць зайцоў».

«Спрытны зайка-шарачок».

Слоўнік: шарак, бяляк, палахлівы.

Матэрыялы. Табліца «Спрытны зайка-шарачок». Вершаваныя творы: Ю. Свірка «Спрытны зайка-шарачок»; І. Карпечанка «Зайка»; І. Юкляеўскі «Пад асінай зайкі след»; С. Шушкевіч «Зайчык вушы прастудзіў».

«Па сасонцы скок ды скок» (2 гадзіны).

«Вось звярок маленькі, чысты». Знешні выгляд вавёркі: поўсць, лапкі, вушкі, вочкі. Паводзіны.

Слоўнік: вавёрка, ваверчаня.

Матэрыялы. Табліца «Вось звярок маленькі, чысты». Вершаваныя творы: У. Дубоўка «Вось звярок маленькі, чысты»; Х. Жычка «У вавёркі-весялушкі»; П. Прануза «Вось дык акрабатка»; Н. Галіноўская «Па сасонцы скок ды скок».

«Вавёрка-працаўніца».

Слоўнік: ласавацца, запасаць, дупло, гайно.

Матэрыялы. Табліца «Вавёрка-працаўніца». Вершаваныя творы: Я. Крупенька «Вавёрка-працаўніца»; А. Вольскі «Вавёрка»; Л. Шырын «Вавёрчына каморка»; Л. Глушко «Скок вавёрка на дубок».

«Бяжыць вожык – тупу-туп». Знешні выгляд: калючкі, лапкі, лычык, вушкі, вочкі. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: вожык, вожычыха, важаня.

Матэрыялы. Табліца «Бяжыць вожык – тупу-туп». Вершаваныя творы: У. Луцэвіч «Бяжыць вожык – тупу-туп»; П. Марціновіч «Ну і дзіўны гэты вожык»; Н. Гілевіч «Вожык, дзе твая хаціна?»; П. Сушко «Цягне вожык».

«Хітрай называюць». Знешні выгляд лісы: поўсць, хвост, лапы, вочы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: ліс, ліса, ліска, лісіца, лісяня.

Матэрыялы. Табліца «Хітрай называюць». Вершаваныя творы: Н. Сторажава «Хітруха»; А. Якімовіч «Навастрыла вушы ліска»; П. Сушко «Ліска курачак лічыла»; У. Корбан «Футра ў ліскі хоць куды!»; Н. Галіноўская «На кірмаш».

«Па лесе воўк бадзяецца». Знешні выгляд: поўсць, хвост, лапы, вушы, вочы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: воўк, ваўчок, ваўчыха, ваўчаня.

Матэрыялы. Табліца «Па лесе воўк бадзяецца». Вершаваныя творы: «Прыйдзе шэранькі ваўчок» (калыханка) (з народнага); В. Вітка «Воўк

схаваўся ў хвошч»; І. Карэнда «Заўсёды ходзіць злы, галодны» (загадка); Я. Пархута «Па лесе воўк бадзяецца»; А. Пісьмянкоў «Ясеў воўк».

«І пайшоў шукаць бярлог». Знешні выгляд мядзведзя: поўсць, хвост, лапы, вушы, вочы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: мядзведзь, мядзведзіца, медзведзяня.

Матэрыялы. Табліца «І пайшоў шукаць бярлог». Вершаваныя творы: Н. Сторажава «Няўмека»; А. Якімовіч «Мядзведзь»; А. Пісьмянкоў «Чаму любяць мядзведзя?»; Ю. Свірка «Разбудзіла Мішку шышка».

«Дзік жыве ў гушчары». Знешні выгляд: шчацінне, іклы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: дзік, дзічыха, парася.

Матэрыялы. Табліца «Дзік жыве ў гушчары». Вершаваныя творы: С. Шушкевіч «Дзік жыве ў гушчары»; Н. Сторажава «Дзяцюк» (загадка);

Р. Тармола «Вунь праз лес ідуць дзікі»; А. Дзеружынскі «Паласатыя бачкі».

«З норкі вылез барсучок». Знешні выгляд: поўсць, хвост, лапы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: барсук, барсучыха, барсучаня.

Матэрыялы. Табліца «З норкі вылез барсучок». Вершаваныя творы: І. Юкляеўскі «З норкі вылез барсучок»; А. Якімовіч «Не ласун барсук»; М. Хведаровіч «Пакаціўся барсучок»; В. Гардзей «Барсук і сарока».

«Гэты слаўны будаўнік». Знешні выгляд бабра: поўсць, хвост, зубы. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: бабёр, бабрыха, бабраня, бабраняты.

Матэрыялы. Табліца «Гэты слаўны будаўнік». Вершаваныя творы: В. Гардзей «Гэты слаўны будаўнік»; М. Ляшкевіч «Робяць грэблю»; П. Сушко «Між азёр пратока»; І. Муравейка «У хаціне бабровай»; В. Вітка «Дабёр-бабёр».

«Ходзіць лось рагаты». Знешні выгляд: рогі, хвост, ногі. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: лось, ласіха, ласяня.

Матэрыялы. Табліца «Ходзіць лось рагаты». Вершаваныя творы: П. Глебка «Ходзіць лось рагаты»; У. Мацвеенка «Лось»; С. Грахоўскі «Захварэла ласяня»; Н. Сторажава «Лясны кароль».

«Белавежаю крочаць зубры». Знешні выгляд: рогі, горб. Паводзіны (1 гадзіна).

Слоўнік: зубр, зубрыха, зубраня.

Матэрыялы. Табліца «Белавежаю крочаць зубры». Вершаваныя творы: Л. Геніюш «Белавежаю крочаць зубры»; М. Чарняўскі «Волат-зубр», «Зубраня зубрыла»; В. Коўтун «Кніга Белавежы».

«Усе птушкі мову маюць» (1 гадзіна).

«Дзяцел – стук, дзяцел – грук». Знешні выгляд: пер’е, крылы, дзюба, лапы. Паводзіны.

«Прыляціць зязюля ў лес». Знешні выгляд: пер’е, крылы, дзюба. Паводзіны.

Слоўнік: дзяцел, дзятлік, дзятліха, дзятляня; зязюля, зязюлька.

Матэрыялы. Табліцы «Дзяцел – стук, дзяцел – грук», «Прыляціць зязюля ў лес». Вершаваныя творы: А. Дзеружынскі «Дзяцел – стук, дзяцел – грук»; Н. Старажава «Будаўнік»; В. Гардзей «Дзятлы-майстры»; І. Муравейка «Не забуду век дзятлоў»; В. Лукша «Прыляціць зязюля ў лес»; М. Чарняўскі «Зязюлька»; Р. Барадулін «Ку-ку, ку-ку!».

«Няма прыгажэй ад маёй Беларусі!». Абагульненне (1 гадзіна).

Слоўнік: адвечны бор, гасцінна, шаты, вітаць.

Матэрыялы. Табліца «Няма прыгажэй ад маёй Беларусі!». Вершаваныя творы: А. Вольскі «Няма прыгажэй ад маёй Беларусі!»; М. Шаховіч «Паляўнічы».

II клас (34 гадзіны, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

«Вакол мяне дзівосны свет!»

Чытанне невялікіх мастацкіх твораў, тлумачэнне значэнняў слоў і ўстойлівых выразаў, увядзенне іх у актыўную лексіку праз адказы на пытанні па змесце прачытанага, праз завучванне скорагаворак, пацешак, лічылак, вершаў, праз наладжванне беларускіх народных гульняў і драматызацыю твораў.

У садзе (4 гадзіны).

Яблык. Яблыня.

Слоўнік: яблык, яблычак; чырвоны, салодкі, духмяны, сакаўны, наліўны.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Пысін «Яблык румяны»; Ю. Свірка «Яблык»; У. Ліпскі «Маша і яблычак»; Я. Хвалей «Хто мастак?»; В. Сцяпурка «Адкуль яблычкі?».

Як расце дрэва. Дзічка. Саджанец. Дрэва. Грушы на грушцы. Гульня «Грушка».

Слоўнік: зярнятка, карэньчык, сцяблінка, дзічка, саджанец, дрэва, ураджай.

Матэрыялы. Мастацкія творы: «Каціўся яблык міма сада» (лічылка) (з народнага); В. Матэвушаў «Груша»; В. Сцяпурка «Дзічка», «Саджанец атрымаўся»; «Дрэва».

Садок пасадзіў – добрую справу зрабіў. Кусты ў садзе.

Слоўнік: кусты: агрэст, маліна, парэчкі; ягады: агрэст, маліны, парэчкі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Цётка «Мой сад»; М. Пазнякоў «Кліча сад»; М. Дукса «У садзе»; Л. Пранчак «Смаката»; П. Макаль «Яблыня»; В. Сцяпурка «Растуць у маім садзе».

Сябры і ворагі сада. Вусень-ненажэра. Шпак увішны. Пчолка-працаўніца.

Слоўнік: вусень; шпак, шпачыха, шпачаня, шпакоўня; пчала, пчолка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: К. Камейша «Ехаў вусень»; Л. Пранчак «Вусень»; П. Сушко «Шпак увішны»; С. Шушкевіч «Я работніца-пчала», «Сеў на градку чорны шпак»; В. Сцяпурка «Вусені ў садзе», «Пчолка-працаўніца», «Як Маша вусеня малявала».

На агародзе (4 гадзіны).

Праца на агародзе. Гульня «Агароднік».

Слоўнік: глеба, насенне, рыдлёўка, баразёнка; ускапаць, пагрэбці, пасадзіць, даглядаць.

Матэрыялы. Мастацкія творы: С. Шушкевіч «Агарод»; М. Пазнякоў «Запрашаю»; В. Сцяпурка «Дружная праца».

Самае смачнае ў зямлі хаваю. Гульня «Рэдзька».

Слоўнік: бульба, бурак, морква, рэдзька.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Р. Барадулін «У агародзе каля градак»; А. Дзеружынскі «Бульба»; М. Пазнякоў «Сакавіты, круглатвары», «З яе цудоўныя салаты» (загадкі); В. Сцяпурка «Рэдзька з мёдам».

Шурпаты агурок. Таўстун гарбуз. Таўстуха капуста. Цыбаты сланечнік.

Слоўнік: агурок, гарбуз, капуста, сланечнік; шурпаты, таўстун, таўстуха, цыбаты.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Пазнякоў «Выраслі на градцы» (загадка); С. Шушкевіч «Гарбуз-таўстапуз»; А. Бібіцкі «Гарбуз»; Л. Геніюш «Капуста»; В. Гардзей «Сонцу брат я»; В. Сцяпурка «Чый агурок?», «Таўстуха капуста»; «Цыбатыя сланечнікі».

Пякучая агародніна. Кроп, салата, боб, фасоля.

Слоўнік: цыбуля, цыбуліна, цыбулька; часнок, кроп, фасоля, салата.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Н. Парукаў «Была маладою», «У бабулі родны брат» (загадкі); Л. Пранчак «На градзе», «Два бабы»; В. Сцяпурка «Лекавыя расліны», «Фасоля».

У кветніку (2 гадзіны).

Яны зацвітаюць першымі. Пахам чаруюць. Гульня «Садоўнік».

Слоўнік: кветка, кветачка, квітнець, кветнік; цюльпан, нарцыс, касач, півоня, бэз, язмін.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Дубоўка «Якіх толькі кветак на свеце няма»; Н. Сторажава «Пан у збане» (загадка); Р. Няхай «Касачы-

вусачы»; А. Церашкова «Што за куст цвіце букетамі?»; В. Сцяпурка «Навошта кветнік?», «Першымі зацвітаюць».

Калючая прыгажуня. Цвітуць да маразоў. Пчолкі, матылькі.

Слоўнік: ружа, вяргіня, астра; гудуць, трымцець.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Н. Сторажава «Красуня» (загадка); М. Пазнякоў «Хвалюе водарам, красою» (загадка); В. Сцяпурка «Чаму дорацць ружы?», «Астры-зорачкі», «Радасць».

У лузе (3 гадзіны).

Лугавыя кветкі. Гульня «Гусі-лебедзі і воўк».

Слоўнік: дзьмухавец, рамонак, канюшына, люцік, званочак.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Н. Галіноўская «Як хораша!»; А. Церашкова «Лугавыя кветкі» (загадкі); Н. Сторажава «Звонкае імя»; М. Пазнанская «Рамонак»; В. Жуковіч «У зялёным лузе».

Хто ў лузе жыве?

Слоўнік: конік, чмель, авадзень, матылёк, камар; лягушка, жаба, вуж; бусел, драч.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Колас «На лузе», «Вось прыйшлі музыкі»; У. Луцэвіч «Па сцяжынцы жвава жабка…»; М. Лужанін «Вуж»; Я. Крамко «Вуж»; Н. Сторажава «Белы птах»; А. Дзеружынскі «Драч не спявае».

Яны пасуцца на лузе. Сенажаць. Сенакос.

Слоўнік: конь, карова, авечка, каза; касавіца, пракосы, стог, атава.

Матэрыялы. Мастацкія творы: «Пайшлі каровачкі» (з народнага); А. Бялевіч «Дзе расце смятана?»; М. Пазнякоў «Пра пракосы і пра косы», «Сенакосная пара»; С. Грахоўскі «Сенакос»; М. Бусько «Сена» (акраверш).

У полі (4 гадзіны).

Ад зярнятка да каласка. Гульня «А мы проса сеялі».

Слоўнік: трактар, трактарыст, плуг, сеялка; камбайн, камбайнер, элеватар.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Пушча «Цешыць поле залатое»; Я. Крамко «Цудоўны час ўборкі ўраджаю!»; Ф. Рамашка «Татава поле»; В. Сцяпурка «Доўгі шлях».

Жыта ад слова «жыць».

Слоўнік: жыта, жніво, жнівень, зажынкі, дажынкі; пшаніца, авёс, ячмень, грэчка, проса.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Е. Лось «Галасы поля»; К. Камейша «Духмянае дзіва»; Л. Пранчак «Хлеб»; А. Дзеружынскі «Хлебная скарынка»; А. Вольскі «Хлеб – усяму галава»; С. Тарасаў «Яўсей, жыта сей!»; В. Жуковіч «Жнівень» (скорагаворка); В. Сцяпурка «У даўнія часы».

Што яшчэ расце на палях?

Слоўнік: цукровыя буракі, рапс, лён; вырошчваць, захоўваць, перапрацоўваць.

Матэрыялы. Мастацкія творы: І. Муравейка «Дождж з-пад зямлі»; Н. Сторажава «Буракі і буякі»; М. Чарняўскі «Лён-ляночак»; Л. Забалоцкая «Лён»; А. Дзеружынскі «Урадзіла бульба»; В. Жуковіч «Блізка свята ураджаю».

Якіх жывёл у полі сустрэнем?

Слоўнік: жаваранак, грак, перапёлка, мыш-палёўка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Л. Мароз «Жаўручок мой, жаўручок»; В. Гардзей «Ходзіць грак, як аграном»; М. Хамянкоў «Грак стаіць на раллі»; В. Вітка «Перапёлка»; А. Дзеружынскі «Палявая мышка»; І. Юкляеўскі «Мышка-палёўка»; В. Сцяпурка «Песня з неба».

У лесе (6 гадзін).

Што такое лес? Які бывае лес?

Слоўнік: дрэвы, кусты, кусцікі, травы, кветкі, грыбы, мох; гай, дуброва, ельнік, бор, пушча.

Матэрыялы. Мастацкія творы: С. Марчанка «Лес»; А. Вольскі «Зялёны бор»; А. Гурыновіч «Бор»; М. Калачынскі «Раніца ў лесе»; М. Танк «Садзіце лясы!».

Дрэвы лесу.

Слоўнік: елка (яліна), сасна (хвоя), таполя, бяроза, рабіна, асіна, вольха, ліпа, вяз, граб, клён, каштан, ясень, дуб.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Колас «Дуб»; І. Карэнда «Шмат гадоў» (загадка); В. Вітка «Не бывае яно голым» (загадка); Я. Галубовіч «Зялёненькі дубочак», «Красуюць ліпы».

Кусты і кусцікі. Кветкі лесу.

Слоўнік: арэшнік (ляшчына), шыпшына, каліна, чаромха, ядловец, парэчкі, маліна; чарніцы, буякі, суніцы, касцяніцы; пралеска, сон-трава, фіялка, званочак.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Хвалей «Арэхі паспелі»; П. Глебка «Ягады»; Я. Галубовіч «У лесе поўна суніц», «Цвіла сон-трава на палянцы».

Грыбы.

Слоўнік: баравік, падбярозавік (абабак), падасінавік, рыжык, махавік, сыраежка, лісічка, апенька, грузд, зялёнка, мухамор.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Скарынкін «Хованкі»; Л. Пранчак «Мухамор»; П. Глебка «Грыбы»; В. Зуёнак «Грыбная кніжка»; Я. Галубовіч «Апенькі верхалазы»; М. Пазнякоў «У грыбах»; В. Сцяпурка «Грыбы».

Лясныя жыхары. Гульні «Заінька», «Мядзведзь».

Слоўнік: алень, рысь, куніца, янот; цецярук, сойка, крыжадзюб; кузурка, мурашка; павук.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Л. Геніюш «Лес»; А. Якімовіч «Звяры нашых лясоў»; М. Скобла «Рысь»; В. Гардзей «Гэты тоўсценькі янот»; Я. Галубовіч «Як хто да зімы рыхтуецца», «Сойкі і дубкі»; В. Гардзей «Сойка-лесавод»; В. Коўтун «Цецярук»; А. Пысін «Небывалы ўзняўся дом»; С. Шушкевіч «Пачапіўся павук».

Чым нас вабіць лес?

Слоўнік: прыгажосць, адпачынак, дарункі лесу.

Матэрыялы. Мастацкія творы: І. Муравейка «Лясныя скарбы»; К. Кірэенка «Летнім днём»; П. Пранузa «Раніца ў лесе»; В. Вярба «У лесе»; В. Жуковіч «Лес»; Я. Крамко «Ласкавы лес», «Думкі ля паляны»; Я. Галубовіч «Маленькі ляснік»; Л. Дайнека «Мы – прыроды вартавыя»; В. Хомчанка «Паклон лесу».

Вадаёмы (6 гадзін).

Крыніца, ручэй. Куды пабег ручаёк? Гульня «Ручаёк».

Слоўнік: сцюдзёная, празрыстая, гаючая, пявучая; гаманлівы, звонкі, неўгамонны.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Вольскі «Крынічка»; М. Чарняўскі «Аб чым пяе крынічка»; У. Ягоўдзік «Жывая вада крыніц»; Р. Дамброўская «Хлопчык і крынічка»; Я. Колас «Ручэй»; Н. Галіноўская «Ручэй»; В. Сцяпурка «Крыніца і ручаёк».

Рака. Куды цякуць рэкі?

Слоўнік: рэчка, рачулка, мора, акіян.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Дзеружынскі «Рэчка»; П. Глебка «На рэчцы»; У. Ягоўдзік «Срэбнакрылыя стужкі»; Я. Крамко «Бяжыць рэчка-невялічка»; У. Мазго «Чараўніцы краю»; С. Тарасаў «Куды бягуць рэкі»; В. Сцяпурка «Крыніца і ручаёк».

Возера, вадасховішча, сажалка.

Слоўнік: азярцо, азёрны, штучнае возера, копанка, сажалка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Вольскі «Азёрны край»; В. Хомчанка «Фарбы возера»; Н. Кісялёва «Пра возера Ячмянёк»; П. Васючэнка «Копанка».

Хто жыве ў вадзе?

Слоўнік: карась, ёрш, шчупак, акунь, пячкур, мянтуз, лінь, плотка, сом, вугор, лешч, уюн; рак.

Матэрыялы. Мастацкія творы: П. Глебка «Бліскучыя рыбы ідуць чарадой»; Н. Галіноўская «Закапаўся карась»; В. Карпечанка «Мы яршыстыя яршы»; М. Скрыпка «Шчупак»; В. Зуёнак «Пад карчом», «Печкурок-паласкун»; Я. Колас «Рак-вусач».

Хто жыве каля вады? Гульні «Журавель», «Рыбак».

Слоўнік: выдра, янот; журавель, чапля, кнігаўка, пліска; страказа, жук-плывунец, вадамерка; чарапаха, яшчарка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Крамко «Рэдкая сустрэча»; Я. Галубовіч «Янот-паласкун», «Сустрэча з выдрай»; «Журавелька даўганогі» (з народнага); В. Жуковіч «Чапля»; А. Дзеружынскі «Кнігаўка кігоча», «Пліска»; В. Гардзей «Страказа»; А. Бадак «Спартсменкі Вадамеркі»; П. Марціновіч «Небарака-чарапаха»; В. Гардзей «Яшчарка».

Чым нас вабіць рэчка, возера?

Слоўнік: купацца, загараць, лавіць рыбу.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Колас «Каля рэчкі»; Э. Агняцвет «Рэчка, рэчанька мая»; У. Карызна «На рыбалцы»; Я. Галубовіч «У госці да рачулкі»; М. Чарняўскі «Ці рака, ці рака».

У горадзе (3 гадзіны).

На вуліцах горада. Плошчы. Гульні «Пошта», «Сонца і месяц».

Слоўнік: вуліца, праспект, бульвар, завулак, плошча.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Х. Жычка «Гарадскія вуліцы»; Е. Лось «Вуліца Берасцянская»; П. Прыходзька «Плошча Якуба Коласа»; Я. Крупенька «Абеліск Перамогі»; А. Астрэйка «Плошча Перамогі»; В. Жуковіч «Сталіца наша родная»; А. Дзеружынскі «Песня аб Мінску».

Гарадскі транспарт. Метро.

Слоўнік: аўтобус, тралейбус, трамвай, метро; тратуар, маставая, пешаходны пераход.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Р. Барадулін «Робяць гораду нутро»; Н. Галіноўская «Метрабудавец»; Н. Сторажава «Метро»; С. Грахоўскі «У метро».

Скверы і паркі горада. Каля фантана. Батанічны сад. У заапарку.

Слоўнік: сквер, парк, фантан; жырафа, кракадзіл, вярблюд, гіена, страус.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Э. Агняцвет «Мінскія сосны»; М. Пазнякоў «Садзім алею»; Т. Жукоўская «Фантаны Мінска»; М. Пазнякоў «У заапарку»; А. Вольскі «Еду ў госці да слана», «Хлопчык глянуў на вярблюда», «Жырафа»; В. Коўтун «Шымпанзе», «Кенгуру»; Л. Рашкоўскі «Поні», «Зебра»; Х. Гурыновіч «Страусы танцуюць»; В. Жуковіч «Хто хацеў бы пакатацца?».

Беларусь – мая Радзіма. Абагульненне (1 гадзіна).

Слоўнік: Радзіма, Бацькаўшчына, Айчына.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Няма даражэйшай зямлі»; А. Зэкаў «Беларускі край»; М. Пазнякоў «Беларусь».

Рэзерв (1 гадзіна).

III клас (35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)
«Я жыву сярод людзей»

Чытанне мастацкіх твораў, тлумачэнне значэнняў слоў і ўстойлівых выразаў, увядзенне ў актыўную лексіку слоў і зваротаў ветлівасці праз

разгорнутыя адказы на пытанні, пабудову дыялогаў і палілогаў па змесце прачытанага, праз наладжванне розных відаў драматызацый і гульняў, праз выказванне сваіх адносін да жыццёвых абставін.

Чалавек (2 гадзіны).

Я – чалавек. Мы – людзі. Дарослыя і дзеці.

Слоўнік: чалавек, людзі, дарослы, дзіця.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Л. Дайнека «Вітаю працай кожны дзень»; А. Александровіч «Наш дзень»; В. Жуковіч «Слова і справа»; М. Валько «Задаюць пытанні дзеці».

Дзяцінства. Маладосць. Сталасць. Старасць.

Слоўнік: дзяцінства, маладосць, сталасць, старасць; узрост, жыцця дары.

Матэрыялы. Мастацкія творы: П. Прануза «Першы крок»; А. Грачаннікаў «Цікаўны ўнук», «Планета дзяцей»; Н. Гілевіч «Калі рана ўстанеш»; Н. Галіноўская «Дзіцячыя радасці»; В. Жуковіч «У горадзе мары».

Хлопчык (3 гадзіны).

Хто я? Які я? Калі я шчаслівы.

Слоўнік: беларус, сыночак, брацік, унук, унучак, сябар; ветлівы, паслухмяны, задзірысты, упарты.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Пісьмянкоў «А мы з братам — беларусы»; Н. Галіноўская «Калі я шчаслівы».

Маё імя. Што я люблю. Што не люблю.

Слоўнік: імя, футбол, хакей, аблокі, легенды, паданні.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Добрая звычка», «Жартаўнік».

Мае мары. Умека і Няўмека.

Слоўнік: мара, марыць, умелы, няўмелы, гультай.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Марацъ хлопчыкі»; Н. Галіноўская «Буду мараком»; Х. Гурыновіч «Буду касманаўтам»; У. Ліпскі «Умека і Няўмека»; В. Жуковіч «Не ўмею, паспею».

Дзяўчынка (3 гадзіны).

Хто я? Якая я?

Слоўнік: дачка, сястра, унучка, сяброўка; працавітая, клапатлівая, гультаяватая, непаслухмяная.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Э. Агняцвет «І адкуль такая звычка?»; Н. Галіноўская «Абяцанкі».

Маё імя. Што я люблю. Што не люблю.

Слоўнік: лялька, цацка, прыгажуня.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Пазнякоў «Лялькам-сяброўкам…» (скорагаворкі).

Я сама. Мае мары.

Слоўнік: памочніца, прасаваць, гатаваць, пераблытаць, трошкі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: І. Багдановіч «Я сама»; Г. Каржанеўская «Памочніца»; Р. Барадулін «Буду ўрачом».

Маці (3 гадзіны).

Дарагая мамачка. Якая мая мама?

Слоўнік: маці, матуля, матулька; родная, пяшчотная; учынкі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Карызна «Самая лепшая»; Л. Пранчак «Мілая, пяшчотная», «Добрай ночы»; І. Муравейка «Добра з мамай»; В. Сцяпурка «Самы блізкі чалавек».

Што я люблю рабіць разам з мамай.

Слоўнік: спяваць, вышываць.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Н. Галіноўская «З мамай»; В. Лукша «Рукі маці».

Вырасту прыгожай і ўмелай, як мама.

Слоўнік: вясёлка, стужка, пяшчота.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Э. Агняцвет «Маме»; С. Валодзька «Калыханка для мамы»; А. Бачыла «Мама захварэла».

Бацька (3 гадзіны).

Тата. Які мой тата?

Слоўнік: тата, татка, татачка; шчыры, памяркоўны, руплівы; клапаціцца.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Ю. Свірка «Добры тата»; Л. Пранчак «Тата»; П. Пранузa «Шчыры адказ»; В. Сцяпурка «Тата».

Разам з татам.

Слоўнік: майстраваць, габляваць, адпачываць.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Пазнякоў «Дамок для Рэкса»; В. Гардзей «Морж», «Любімы прадмет»; К. Карнялюк «Разам з бацькам».

Вырасту дужым і працавітым, як тата.

Слоўнік: шчыраваць заўзята, абяцанне, шанцаваць.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Кудлачоў «Вырасцеш, як тата»; В. Зуб «Колеў вораг»; К. Карнялюк «Падобны на тату» (жарт).

Бабуля (3 гадзіны).

Мая бабуля. Якая яна?

Слоўнік: бабуля, бабулька, бабулечка; старэнькая, маладая, ласкавая, клапатлівая.

Матэрыялы. Мастацкія творы: І. Мураўёў «Бабуля»; А. Дзеружынскі «Бабулі»; Я. Жабко «Бабуліна крынічка»; В. Сцяпурка «У каго якія ўнукі?».

Да бабулі ў госці.

Слоўнік: бярозавая каша.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Вітка «Бабіны госці»; П. Пранузa «Гаспадынька».

З бабуляй весела гуляць, працаваць, адпачываць.

Слоўнік: чысціня, вазон, люстра; захварэць, падабацца, папяровая сурвэтка, крыштальны.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Юрэвіч «Паслухмяная анучка»; А. Рогава «Каралеўства сняжынак»; М. Чарняўскі «Чарадзейныя пруткі».

Дзядуля (3 гадзіны).

Мой дзядуля. Які ён?

Слоўнік: дзед, дзядуля, дзядулечка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Ю. Свірка «У Ганулі тры дзядулі»; В. Зуёнак «Дзяды»; Л. Пранчак «Крыўда»; К. Карнялюк «Валасы пахаваліся».

Слаўна з дзедам бавіць час.

Слоўнік: засмуціцца, непаседа, кіравацца, зацішак.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Ліпскі «Маша і дзед»; У. Мацвеенка «Дзе? Чаму? Калі і як?»; Н. Галіноўская «Падарунак дзеду».

Разам з дзедам я працую.

Слоўнік: цікаўны, дапытлівы, мурзуля.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Чарняўскі «Майстры»; Н. Галіноўская «Працую з дзедам»; Э. Агняцвет «Дудка»; В. Ткачоў «Дзядулева тайна».

Сям'я (5 гадзін).

Дружная сям'я.

Слоўнік: сям'я, сямейка, бацькі, радня, родзічы, сваякі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Сям'я», «Сястра»; Л. Пранчак «Мама, тата і Агата»; У. Ліпскі «Машына сям'я»; В. Хомчанка «Яблык».

Абавязкі ў сям'і дарослых і дзяцей.

Слоўнік: праца, вучоба; дапамагаць адзін аднаму.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Пра абавязкі»; М. Чарняўскі «Звярынец захварэў».

Як сям'я адпачывае?

Слоўнік: паходы, экскурсіі, паездкі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Н. Галіноўская «Сямейны хор»; В. Жуковіч «Сямейны аркестрык».

Святы ў сям'і.

Слоўнік: дзень нараджэння, Новы год, Каляды, Вялікдзень, 8 Сакавіка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Жабко «Самы любы мой дзянёк»; В. Жуковіч «Сястрычкі», «Каляды», «Навагодняю раніцай»; Х. Гурыновіч «Маміна свята».

Сямейныя казкі.

Слоўнік: чараўнік, абрус, стомлены, ахвотна.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Маліноўскі «Сямейка чараўнікоў»; В. Вітка «Радасць».

Рады чалавек чалавеку (3 гадзіны).

Сяброўства. Што значыць сябраваць?

Слоўнік: сябар, сяброўка, сябраваць, сяброўства.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Карызна «Радасць»; Ю. Гусеў «Сяброўкі»; М. Пазнякоў «На горку»; Ю. Свірка «Сябры»; Н. Цвірко «Аляксейка і сябры».

Што любіць сябар?

Слоўнік: разважаць, павіншаваць са святам, паштоўка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: «У добрага чалавека…» (прыказкі) (з народнага); А. Пісьмянкоў «Кавалеры»; В. Ткачоў «Пісьмо».

Чаму сябар пакрыўдзіўся?

Слоўнік: напаткаць, пакрыўдзіць, цвяліцца, хвацка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: І. Муравейка «Надзейчына няшчасце»; М. Лук «Выпадак з марожаным».

Між людзей і з людзьмі (3 гадзіны).

Суседзі.

Слоўнік: паводзіны, карысныя справы.

Матэрыялы. Мастацкія творы: «Без брата…» (прыказка) (з народнага); П. Васючэнка «Залаты знак вясны»; М. Чарняўскі «Спрэчка»; М. Маляўка «Новы дзень».

У школе.

Слоўнік: настаўнікі, аднакласнікі; старэйшыя і малодшыя вучні.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Свята ў будзень», «Пасля канікулаў»; М. Капыловіч «Сачыненне»; К. Цвірка «У школу»; М. Дукса «Кветкі выпускнікам».

Незнаёмыя людзі.

Слоўнік: вуліца, транспарт, магазін (крама), бібліятэка, кнігарня, тэатр.

Матэрыялы. Мастацкія творы: П. Кавалёў «Падзяка»; А. Пальчэўскі «Добрае слова».

Мае захапленні (2 гадзіны).

Сябрую з кнігамі.

Слоўнік: бібліятэка, кнігарня, легенды, паданні, сказы.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Пазнякоў «Мая бібліятэка»; В. Жуковіч «Залацінкі»; К. Цвірка «У кнігарні».

Мой любімы вучэбны прадмет. Мае гурткі. Любімыя гульні.

Слоўнік: вучэбны прадмет, паліглот, гурток; фантазёры, віртуальны свет, чэмпіён.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Дукса «Паліглот»; Х. Гурыновіч «Жывы куток»; Н. Галіноўская «Фігурыстка», «Хакей»; В. Зуёнак «Пачакай, дзядуля Марс!..»; У. Мазго «Света з інтэрнэта»; У. Корбан «Тры вучні».

Шануй людзей, то і цябе пашануюць. Абагульненне (1 гадзіна).

Слоўнік: шчодры знак, бездапаможны, суцэльны.

Матэрыялы. Мастацкія творы: У. Паўлаў «Пакланіся добрым людзям»; А. Якімовіч «Хто самы добры?»; У. Корбан «Мазіла».

Рэзерв (1 гадзіна).

IV клас (35 гадзін, з іх 1 гадзіна – рэзервовая)

«Для чаго мы, людзі, на зямлі жывём»

Чытанне мастацкіх твораў, тлумачэнне значэнняў слоў, якія абазначаюць народныя рамёствы, прылады працы, назвы прафесій і вырабы, увядзенне іх у актыўную лексіку праз разгорнутыя адказы на пытанні, пабудову паведамленняў па змесце прачытанага і даследаванага, праз наладжванне розных маўленчых сітуацый і гульняў, праз выказванне сваіх меркаванняў.

Падарожжа ў горад Майстроў (15 гадзін)

Уводзіны. На плошчы горада Майстроў.

Слоўнік: майстар, майстэрня.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Сям'я майстроў», «Горад Майстроў»; прыказкі пра ўмельства майстра.

Кавальства. У кузні.

Як працуе каваль?

Слоўнік: каваль, кузня, горан, кавадла, варштат.

Матэрыялы. Мастацкія творы: С. Шушкевіч «Кузня» (урывак); В. Сцяпурка «У кузні», «Як працуе каваль»; скорагаворка пра працу каваля.

Што кавалі кавалі?

Слоўнік: гаспадарчыя прылады, даспехі, зброя.

Матэрыялы. Мастацкія творы: С. Шушкевіч «Кузня» (працяг); В. Сцяпурка «Што кавалі кавалі?»; прыказкі на тэму майстэрства каваля; загадкі на тэму вырабаў каваля.

Ткацтва. У майстэрні ткача.

Слоўнік: ткач, ткачыха, ткацтва, кросны.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Г. Пашкоў «Юная ткачыха»; В. Сцяпурка «Як працуе ткач», «Што ткалі ткачы»; скорагаворкі на тэму працы ткача.

Матэрыялы для ткацтва.

Слоўнік: лён, лянок, ляночак; воўна.

Матэрыялы. Мастацкія творы: К. Свірка «Семя»; В. Сцяпурка «Лён, лянок, ляночак»; «Лён не расце сам па сабе», «Воўна», «Як пралі ніткі»; скорагаворкі на тэму працы з ільном; загадкі пра прылады працы ткача.

Пашыў адзення.

Слоўнік: кравец, краўчыха, швачка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Дзеружынскі «Краўчыха»; В. Сцяпурка «Што шылі краўцы»; прыказкі на тэму ўмельства краўца і абыходжання з адзеннем.

Вязанне.

Слоўнік: вязанне, вязальшчыца, шыдэлак (кручок), пруткі, карункі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Н. Сторажава «Хадулі», «Павучок»; В. Сцяпурка «Хто займаўся вязаннем?», «Што вязалі вязальшчыцы?».

Выраб абутку.

Слоўнік: шавец, скура, дратва, капыл, абутак.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «У майстэрні шаўца», «Што шылі шаўцы?», «Самы старажытны абутак».

Пляценне.

Слоўнік: пляценне, пляцельшчык.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Матэрыялы і інструменты для пляцення», «Што плялі пляцельшчыкі?»; скорагаворкі пра вырабы пляцельшчыкаў.

Сталярства.

Слоўнік: сталяр, сталярня, сталярства, куфар.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «У майстэрні сталяра», «Што выраблялі сталяры?», «Куфар»; прыказкі аб прыладах працы сталяра.

Ганчарства.

Як нараджаецца посуд?

Слоўнік: ганчар, ганчарства; гліна, глінішча; ганчарны круг, горан.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Вольскі «Ганчар»; В. Сцяпурка «Як нараджаецца посуд?», «Як посуд робіцца моцным?»; скорагаворка пра ўмовы працы ганчара.

Што выраблялі ганчары?

Слоўнік: гаршчок, збанок, гладыш, гляк; свістулька, бразготка.

Матэрыялы. Мастацкія творы: С. Шушкевіч «Ганчары»; В. Сцяпурка «Посуд», «Цацкі».

Хлеб на стале – свята ў доме.

Слоўнік: дзяжа, пекар-хлебапёк; скарынка, скіба, луста, акраец.

Матэрыялы. Мастацкія творы: П. Панчанка «Хлебныя словы»; В. Гардзей «Зайцаў хлеб»; В. Сцяпурка «Галоўная ежа», «Як выпякалі хлеб?», «Хлебапрадукты»; народныя выслоўі пра хлеб.

Казкі горада Майстроў.

Слоўнік: спрыт, чароўны, лагчына.

Матэрыялы. Мастацкія творы: «Лёгкі хлеб» (беларуская народная казка); Ф. Крывін «Гліняная казка»; К. Каліна «Чароўныя дудачкі»; Б. Шаргін «Доўгая нітка – лянівая швачка»; В. Сцяпурка «Залаты куфэрак»; прыказкі на тэму паважлівых адносін да працы.

Кірмаш у горадзе Майстроў.

Слоўнік: кірмаш, тавар, пакупнік.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Кірмаш у горадзе Майстроў»; прыпеўкі на тэму адзення і абутку.

«Перад табою тысячы дарог…» (19 гадзін)

У горадзе (10 гадзін)

На вуліцах горада.

Уводзіны. Будаўніцтва. Будаўнікі.

Слоўнік: архітэктар, інжынер; бульдазерыст, кранаўшчык, муляр, сантэхнік, электрык, маляр.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Дзеружынскі «Адкуль з’явіліся рамёствы»; М. Маляўка «Як дом будавалі»; Я. Крупенька «Дзякуй будаўнікам»; Н. Парукаў «Мае хобат…» (загадкі); Л. Пранчак «Пад’ёмны кран»; В. Сцяпурка «Хто будуе дамы?».

Перавозка людзей, грузаў.

Слоўнік: шафёр, вадзіцель, машыніст.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Э. Агняцвет «Хто пачынае дзень?»; К. Камейша «Метрабудаўцы»; Л. Пранчак «Аўтобус, тралейбус, трамвай»; В. Сцяпурка «Цікавая прафесія»; «Падземны транспарт».

Хто вырабляе машыны і рэчы.

Слоўнік: канструктар, токар, слесар, зваршчык.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Канструктар»; «Інжынер»; «Рабочыя».

Дапамога людзям зберагчы здароўе.

Слоўнік: урач, лекар; педыятр, тэрапеўт, стаматолаг, хірург, акуліст; медсястра, фармацэўт.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Д. Слаўковіч «Чыя хвароба лепшая?»; В. Сцяпурка «Доктар».

Хто нас абслугоўвае.

Слоўнік: прадавец, цырульнік, паштальён, повар.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «У гарговым цэнтры», «Хто можа працаваць поварам?», «Цырульнік», «Праца паштальёна».

Завітаем у бібліятэку.

Слоўнік: бібліятэкар, пісьменнік, журналіст.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Паэзія», «Паэт»; М. Пазнякоў «Кніга»; В. Сцяпурка «У школьнай бібліятэцы», «Як становяцца пісьменнікамі?».

Наведаем выставу, музей.

Слоўнік: мастак: скульптар, жывапісец, графік; фатограф, экскурсавод.

Матэрыялы. Мастацкія творы: А. Вольскі «Песня мастака»; В. Жуковіч «Каб быў я мастак»; Н. Галіноўская «Мастак».

Завітаем у тэатр.

Слоўнік: рэжысёр, артыст, дэкаратар, кампазітар.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Кампазітар», «Танцорка»; М. Маляўка «Песня».

Захапляемся спортам.

Слоўнік: трэнер, стадыён, спартыўная зала, басейн.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Маляўка «Велагонка»; М. Чарняўскі «Вясёлы крос»; Я. Крупенька «Будзем спартсменамі».

Адпраўляемся ў падарожжа.

Слоўнік: цягнік, машыніст, праваднік; лётчык, сцюардэса; капітан, матрос.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Зуёнак «За вагонам бег вагон»; К. Кірыенка «Размова з капітанамі».

У вёсцы (5 гадзін)

Праца ў полі.

Слоўнік: аграном, механізатар: трактарыст, камбайнёр.

Матэрыялы. Мастацкія творы: М. Маляўка «Аграном»; М. Чарняўскі «Буркатун»; С. Грахоўскі «Адкуль прыйшоў абед?» (урывак); М. Пазнякоў «Мінскі трактар».

Праца на ферме.

Слоўнік: жывёлавод, аператар машыннага даення, канявод, птушкавод.

Матэрыялы. Мастацкія творы: І. Муравейка «Эх, як добра працаваць!»; Х. Гурыновіч «Маленькая даярка».

Хто лечыць жывёл.

Слоўнік: ветэрынар.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Хто такі ветэрынар?», «Ці кожны можа стаць ветэрынарам?», «Старажытная прафесія».

Праца на пасецы.

Слоўнік: пчаляр, пчальнік.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Х. Гурыновіч «Мы на пасецы былі»; Я. Бяганская «Юрка і пчолы»; В. Лапцік «На пасецы».

Праца ў лесе.

Слоўнік: ляснічы, ляснік.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Бяганская «Міколкава ялінка»; Д. Слаўковіч «Незвычайная этыкетка».

Новая прафесія: праграміст (1 гадзіна)

Слоўнік: камп’ютар, манітор, клавіятура, блок.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Сцяпурка «Разумная машына», «Хто такі праграміст?», «Работа творчая і адказная».

Школа – пачатак усіх прафесій (3 гадзіны)

Прафесія – настаўнік.

Слоўнік: настаўнік пачатковых класаў, настаўнік-філолаг, настаўнік біялогіі, хіміі, настаўнік матэматыкі, фізікі, астраноміі.

Матэрыялы. Мастацкія творы: В. Жуковіч «Першая настаўніца»; Э. Агняцвет «Твая настаўніца»; Д. Слаўковіч «Настаўнік».

Паклон вам, настаўнікі.

Слоўнік: яднаць, здзяйсняць, радаводныя крыніцы.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Э. Агняцвет «Буду настаўнікам»; М. Маляўка «Паклон вам, настаўнікі».

Абагульненне.

Я выбіраю прафесію…

Слоўнік: прафесія, прафесіянал.

Матэрыялы. Мастацкія творы: Я. Хвалей «Урок працы»; М. Маляўка «Усё пачынаецца з рук»; А. Грачаннікаў «Бацькоўскі пірог».

Рэзерв (1 гадзіна).